ужо у яе назве «Развіваем турызм на Навагрудчыне разам!», – пачала размову Н. Кавалевіч. – Ідэя накіравана ў першую чаргу на прыцягненне да развіцця ўнутранага турызму мясцовай супольнасці – мы імкнуліся ўзаемадзейнічаць не толькі з зацікаўленымі, але і з мясцовымі жыхарамі і паказаць ім важнасць захавання і папулярызацыі гістарычна-культурнай спадчыны Навагрудчыны. Лічу, што нам гэта ўдалося. Грамадскасць далучылася да мерапрыемстваў па стварэнні новага турыстычнага прадукта.

– Вялікі рэзананс сярод навагрудчан атрымалі конкурсы фотаздымкаў «Любімая Навагрудчына» і дзіцячых малюнкаў «Навагрудскі край, які я берагу», – адзначыла каардынатар ініцыятывы. – У конкурсах прынялі ўдзел каля 100 чалавек. Было пададзена 60 фотаработ і 99 дзіцячых малюнкаў. Пераможцы і прызёры вызначаліся па выніках народнага галасавання і з улікам выбару конкурснага журы. З работамі ўдзельнікаў можна было пазнаёміцца на выстаўцы ў карціннай галерэі Кастуся Качана. Мастак і яго жонка гасцінна прынялі ўдзельнікаў конкурсаў, іх родных і жыхароў горада пры правядзенні выстаўкі і цырымоніі ўзнагароджання. Таксама К. Качан правёў для ўсіх экскурсію і майстар-клас. Па выніках конкурсу дзіцячага малюнка былі распрацаваны і выпушчаны календары на 2018 год, а па выніках конкурсу фотаздымкаў – наборы паштовак і камплекты пазлаў «Славутасці Навагрудчыны». Гульні не толькі прапануюцца турыстам, але і былі перададзены ва ўстановы дашкольнай адукацыі горада і раёна, каб рабяты знаёміліся з гістарычна-культурнай спадчынай роднага краю ў гульнявой форме.

Адным з прыярытэтных напрамкаў развіцця рэгіёну з'яўляюцца паляпшэнне інфраструктуры турызму каля аб'ектаў гісторычна-культурнай спадчыны (установка інфармацыйных шчытоў, указальнікаў і г.д.) і абуладкаванне турыстычных маршрутаў. Як расказала Н. Кавалевіч, з гэтай мэтай быў праведзены двухдзённы семінар па вывучэнні правілаў стварэння будуць выкарыстоўвацца пры правядзенні велапрабегаў.

Таксама ў рамках ініцыятывы былі выдадзены рэкламна-інфармацыйныя матэрыялы, якія ўжо даступны для турыстаў у нашым цэнтры, гасцініцах, аграсядзібах і г.д. Варта адзначыць, што буклеты выдадзены на рускай, польскай і англійскай мовах. Для паляпшэння арыентавання турыстаў у горадзе былі ўстаноўлены дарожныя турыстычныя знакі на карычневым фоне «Навагрудскі замак».

– Яшчэ да рэалізацыі гэтай ініцыятывы мы прыйшлі да высновы, што для фарміравання пазнавальнасці турысцкай сферы нашага краю і з мэтай яе далейшай папулярызацыі неабходны своеасаблівы брэнд, – працягвае размову Н. Кавалевіч. – Мы спыніліся на вобразе Архангела Міхаіла, які знаходзіцца на гербе горада. У рамках ініцыятывы выраблена 10 малых архітэктурных форм Архангела Міхаіла, якія будуць размешчаны ў розных месцах гістарычнай часткі горада.

– Вялікую ролю ў папулярызацыі любога прадукта, у тым ліку і ў сферы турызму, іграюць сродкі масавай інфармацыі, – пераканана Наталля. – Менавіта таму 6 снежня 2017 г. быў арганізаваны прэс-тур для прадстаўнікоў СМІ і турыстычных фірм Беларусі. Удзельнікі пабывалі на Замкавай гары, у Доме-музеі А. Міцкевіча, гістарычна-краязнаўчым музеі, музеі міні-макетаў горада ў раённай бібліятэцы, цэнтры рамёсленай культуры, а таксама ў Свята-Мікалаеўскай царкве. Удзельнікі тура змаглі ацаніць і ўзровень гасціннасці нашых аграсядзіб, якія прадставілі свае лепшыя стравы. Для ўдзельнікаў тура была арганізавана экскурсія ў Мір, дзе яны наведалі Мірскі замак і Свята-Троіцкую царкву.

Для ўдзельнікаў тура была падрыхтавана і спецыяльная інфармацыйная прадукцыя. Раздзелы «Ад рэгіёне», «Анонс мерапрыемстваў», «Як дабрацца», «Дзе спыніцца», «Што наведаць», «Чым заняцца», «Што павезці з сабой» гавораць самі за сябе. Большасць з іх маюць падраздзелы, што спрашчае пошук неабходнай інфармацыі. Таксама тут размешчаны зместкі пра адрасы банкаматаў, тураператараў у Навагрудку і інш. Вялікі плюс рэсурсу – наяўнасць інфармацыі на некалькіх мовах (рускай, беларускай, англійскай і польскай). Таму пагаджуся з Наталляй: сайт «Турызм і адпачынак на Навагрудчыне» значна спрашчае турыстам арганізацыю адпачынку ў нашым рэгіёне. Ды і мясцовым жыхарам будзе карысны пры арганізацыі падарожжа па родным краі.

– Лічу, што мэты ініцыятывы дасягнуты і рэалізацыя гэтага праекта станоўча адаб'ецца на развіцці турызму ў раёне, што ў сваю чаргу будзе садзейнічаць яго ўстойліваму развіццю, – адзначыла напрыканцы Н. Кавалевіч. – Гэта пацвярджае і тое, што на выніковым мерапрыемстве, якое прайшло 20 снежня 2017 г., быў пакладзены пачатак стварэнню грамадскага савета па турызме і велатурызме Навагрудскага раёна. З'явіліся новыя ідэі, але пра гэта ў іншы раз. Спадзяюся, што нашы мерапрыемствы дазволілі мясцовым жыхарам адчуць сваё дачыненне да папулярызацыі гісторычна-культурнай спадчыны Навагрудскага раёна. Карыстаючыся выпадкам, хачу падзякаваць кіраўніцтву райвыканкама за падтрымку. Адзначыць дапамогу нашых партнёраў: гісторычна-краязнаўчага музея, карціннай галерэі К. Качана, фізкультурна-спартыўнага клуба, Цэнтра культуры і народнай творчасці, установ адукацыі. Таксама хачу падзякаваць рэдакцыі газеты «Новае жыццё» і тэлепраграме «Нова-ТБ» за пастаяннае асвятленне ходу рэалізацыі нашай ініцыятывы і ўсім, хто прыняў удзел у нашых мерапрыемствах. Зрабіць наш край яшчэ больш вядомым у Беларусі і за яе мяжамі можна толькі разам.

А. ЗАЙКО, «НЖ».

Д.Я. Зайко і У.С. Свірыд.

Словы віншавання ў адрас выратавальнікаў у гэты дзень таксама гучалі ад начальніка Навагрудскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Уладзіміра Сяргеевіча Свірыда.

Ён сардэчна падзякаваў выратавальнікам за іх добрасумленную самаадданую працу, адзначыў усе асноўныя этапы дзейнасці ў мінулым годзе, якія з гонарам былі пройдзены. Затым расказаў аб асноўных планах на 2018 год, для ажыццяўлення якіх прыйдзецца ўсім нямала папрацаваць.

Я.І. Смаляк і П.В. Гушча.

Сведчаннем прафесіяналізму работнікаў аддзела па надзвычайных сітуацыях стала ўручэнне ва ўрачыстай абстаноўцы ганаровых грамат і падзяк райвыканкама і раённага Савета дэпутатаў – П.В. Гушчу, У.І. Мядзведзю, а таксама грамат Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Рэспублікі Беларусь – В.В. Урбановічу, Я.С. Навасаду, Я.І. Смаляку і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь – В.Г. Маляўскаму, нагрудным знакам «Выдатнік» быў адзначаны А.А. Асіповіч, а спецыяльнае званне на ступень вышэйшае прызначана старшаму прапаршчыку Д.Я. Зайко.

Добры настрой выратавальнікам і гасцям у гэты дзень дарылі работнікі культуры Навагрудчыны і работнікі раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях.

В. ПІСАР, «НЖ».